## СЛЫШАНКОЎ ФЁДАР ФЁДАРАВІЧ



**Месца нараджэння:** в. Ваўчкі, Шумілінскі раён

**Дата нараджэння:** 20.05.1923

**Дата смерці:** 05.10.1943

**Месца подзвігу:** г. п. Обаль, Шумілінскі раён

**Дата подзвігу:** 1941–1944

**Ушанаванне:** г. п. Обаль – вуліца, помнік, музей

Удзельнік Обальскага камсамольскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З мая 1942 года – член камсамольскай арганізацыі «Юныя мсціўцы», якая дзейнічала ў Шумілінскім раёне Віцебскай вобласці. Па заданні камандавання атрада імя Варашылава партызанскай брыгады імя У. І. Леніна і Сіроцінскага падпольнага РК ЛКСМБ падпольшчыкі збіралі і перадавалі партызанам зброю, медыкаменты, звесткі разведкі пра размяшчэнне варожых войск, рух войск, эшалонаў, рабілі дыверсіі на варожых аб’ектах, знішчалі акупантаў і іх тэхніку, вялі палітычную агітацыю сярод насельніцтва, распаўсюджвалі лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро. 28 жніўня 1943 г. Ф. Ф. Слышанкоў разам з іншымі падпольшчыкамі быў арыштаваны і пасля катаванняў расстраляны. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

Імем Ф. Ф. Слышанкова названа вуліца ў г. п. Обаль Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці. У Обалі ў гонар падпольшчыкаў пастаўлены помнік і створаны Обальскі музей камсамольскай славы.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Захаранка, А.** У бой вялі непрымірымыя … / А. Захаранка // Маладосць. – 2004. – № 5. – С. 124–130.

2. **Набатов, Г. О.** Юные подпольщики / Г. О. Набатов. – М. : Политиздат, 1966. – 144 с.

3. **Обальскае** камсамольскае падполле // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя : у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1969–1975. – Т. 7 : Манцякі – Паддубічы. – 1973. – С. 563.

4. **Слышанков** Фёдор Фёдорович // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 558.

**Слышанков** Фёдор Фёдорович // Их именами названы… : энцикл. спр. / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1987. – С. 558.

**СЛЫШАНКОВ ФЁДОР ФЁДОРОВИЧ**
**(20.5.1923 – 5.10.1943)**

Родился в д. Волчки Шумилинского р-на. Член ВЛКСМ. Окончив 7 классов Обольской средней школы, с 1940 работал на Обольском кирпичном заводе. С мая 1942 член Обольской подпольной комсомольской организации «Юные мстители», созданной из комсомольцев Обольской средней школы и молодежи деревень Ушалы, Зуи, Мостище, Ферма. Юные подпольщики были зачислены в партизанский отряд им. К. Е. Ворошилова. Вместе с другими подпольщиками Ф. Ф. Слышанков расклеивал на домах вражеского гарнизона и распространял среди жителей Оболи и соседних деревень партизанские листовки, собирал и передавал партизанам сведения о передислокации живой силы и военной техники противника, о размещении его огневых точек; участвовал в диверсиях на шоссейной дороге Витебск – Полоцк, на льнозаводе ст. Оболь, где было сожжено 2 тыс. тонн льноволокна, приготовленного гитлеровцами для отправки в Германию. 28.8.1943 арестован вместе со многими подпольщиками и после пыток расстрелян в д. Боровуха под Полоцком. Посмертно награжден орденом Отечественной войны I степени.

Именем Ф. Ф. Слышанкова названа улица в г. п. Оболь; членам подпольной организации «Юные мстители» поставлен памятник в г. п. Оболь.